УДК 343.35:340.1(091)

# КАРУПЦЫЯ Ў ПАЛІТЫКА-ПРАВАВОЙ ДУМЦЫ: АД СТАРАЖЫТНАСЦІ ДА НОВАГА ЧАСУ

**А. Д. Воінава**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,
студэнт

**В. М. Лянцэвіч**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,
дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

***Анатацыя.*** *Артыкул прысвечаны даследаванню прыроды і сутнасці карупцыі як сацыяльнай з'явы ў працах выдатных мысляроў Старажытнасці, Сярэднявечча і Новага часу для выяўлення істотных яе ўласцівасцяў і ролі ў жыцці грамадства.*
***Ключавыя словы:*** *карупцыя, сацыяльная прырода карупцыі, сутнасць карупцыі, палітыка-прававая думка.*

***Annotation:*** *The article is dedicated to the study of the nature and essence of corruption as a social phenomenon in the works of outstanding thinkers of Antiquity, the Middle Ages and the Modern era in order to reveal its essential properties and role in the life of society.*
***Keywords:*** *corruption, social nature of corruption, essence of corruption, political and legal thought.*

Сацыяльна-прававая прырода сутнасці з'яўляецца адным з важнейшых крытэрыяў пры аналізе любога феномену, паколькі менавіта гэтая катэгорыя аказвае істотны ўплыў на фарміраванне прававой сістэмы, уключаючы распрацоўку і прыняцце заканадаўчых і іншых нарматыўных прававых актаў. Існуе некалькі значэнняў тэрміна «сутнасць». Па-першае, традыцыйная трактоўка разумее пад сабой «внутреннее содержание предмета, обнаруживающееся во внешних формах его существования» [1, с. 1963]. Па-другое, ужыванне дадзенага паняцця ў філасофіі адлюстроўвае «всеобщие формы объективного мира, его познания и практической деятельности людей… внутреннее содержание предмета, выражающееся в единстве всех многообразных и противоречивых форм его бытия…» [2, с. 665]. Ва ўмовах эвалюцыі прававой сістэмы праблема інтэрпрэтацыі сутнасці і сацыяльнай прыроды праваадносін набывае празмерную значнасць, паколькі для рэфармавання прававой сістэмы неабходны новыя трактоўкі і падыходы.

Аналіз сутнасці і сацыяльна-прававой прыроды карупцыі ўяўляе сабой інтэрпрэтацыю, задача якой заключаецца ў выдзяленні элементаў, якія ўваходзяць у паняцце карупцыі: суб'ектны склад, аб'ект, змест карупцыйных адносін, сацыяльная, палітычная і эканамічная ацэнка гэтай з'явы, дактрынальнае

разуменне гэтага феномена, а таксама замацаванне адказнасці за карупцыю ў юрыдычнай форме ў кантэксце дзеючага заканадаўства.

Інтэрпрэтацыя карупцыі бачыць сваё значэнне ў неабходнасці фарміравання фундаментальных палажэнняў, замацаваных у заканадаўчых і іншых прававых актах, дзяржаўнай палітыцы ў гэтай сферы, якія пасадзейнічалі б процідзеянню дадзенай з’яве. Заканадаўства, якое замацоўвае меры па барацьбе з карупцыяй, з’яўляецца толькі знешнім выразам супрацьдзеяння дадзенаму феномену. Корань гэтай праблемы расце з сацыяльных працэсаў. Знешняе замацаванне не азначае эфектыўную барацьбу з такой негатыўнай з’явай у сярэдзіне сістэмы, таму прабелы ў прававым рэгуляванні вызначаных грамадскіх адносін, калізіі ў нормах права, а таксама адсутнасць канкрэтыкі або недастатковасць у тлумачэнні нормаў могуць паспрыяць развіццю карупцыі. Варта падкрэсліць, што заканадаўства здольна самастойна выкараняць сацыяльныя прычыны гэтай негатыўнай з’явы. Карупцыя — вынік працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве, сярод іх палітычная нестабільнасць, інфляцыя, эканамічная неплацежаздольнасць, паслабленне сістэмы сацыяльнага кантролю, адсутнасць маральных нормаў у адных і дэградацыя гэтых нормаў у іншых. Недахопы прававой сістэмы з’яўляюцца толькі адным з фактараў, якія садзейнічаюць росквіту карупцыі. Таму зразумела, што супрацьдзеянне карупцыі павінна ажыццяўляцца па волі палітычных і дамінуючых сіл у дзяржаве, пры ўздзеянні на свядомасць людзей, бо толькі такім шляхам яны змогуць зразумець неабходнасць у выкараненні гэтага сацыяльнага зла. У такім выпадку можам назваць гэта галоўнай умовай для фармавання сродкаў у правядзенні антыкарупцыйнай палітыкі дзяржавы.

Даследаванне сутнасці і сацыяльна-прававой прыроды карупцыі цесна звязана з аналізам этымалогіі дадзенага паняцця, найбольш значных элементаў, якія ўваходзяць у змест паняцця «карупцыя» [3, с. 175]. Калі зыходзіць з этымалагічнага аналізу тэрміна «карупцыя», то лацінскае «corrumpere» абазначае знішчэнне, подкуп, спакушэнне, задорванне падарункамі. У рымскім праве дадзены тэрмін ужываўся ў адносінах да дзейнасці асоб, якія нейкім чынам скажалі судовы працэс або працэс кіравання справамі. Часам мае месца быць і іншы пункт гледжання ў вызначэнні паходжання паняцця «карупцыя»: тэрмін склаўся ад зліцця лацінскіх слоў «correi», якое азначае дачыненне некалькіх удзельнікаў аднаго з бакоў адносін, якія маюць абавязацельны характар, дзе прадметам выступае адзін аб’ект, а «rumpere» выступае ў якасці такіх дзеянняў як: ламаць, пашкоджваць, парушаць, адмяняць. У выніку зліцця двух слоў адбываецца новы тэрмін, які характарызуе дзейнасць дзвюх і больш асоб, здольных парушыць нармальны ход судовага працэсу [4, с. 93, 280].

Першую трактоўку паняцце «карупцыя» атрымала ад Платона (427–347 гг. да н. э.). Філосаф пры пабудове канцэпцыі ідэальнай дзяржавы не даваў магчымасцяў кіраўнікам (філосафам) і воінам мець штосьці ў іх уласнасці: «Ведь только в таком государстве будут править те, кто на самом деле богат, — не золотом, а тем, чем должен быть богат счастливый: добродетельной и разумной жизнью. Если же бедные и неимущие добиваются доступа к общественным благам, рассчитывая урвать себе оттуда кусок, тогда не быть добру <…> » [5, с. 357]. Платон лічыў, што любы чалавек здольны несумленна паступіць у адносінах да дзяржавы і грамадства, калі даць яму на гэта волю, нават калі яго маральныя якасці былі на высокім узроўні.

Арыстоцель (384–322 гг. да н. э.) тэму карупцыі таксама не пакінуў незаўважанай і ў сваім творы «Палітыка» разгледзеў дадзенае паняцце як адну з магчымых дэтэрмінант гібелі дзяржавы. У працэсе пагібельнага ўздзеяння карупцыі на дзяржаву Арыстоцель адзначае пераход ад манархіі да тыраніі, гэта значыць ад здаровай формы кіравання да нездаровай, што прыводзіць да парушэння функцыянавання дзяржавы: «Самое главное при всяком государственном строе — это посредством законов и остального распорядка устроить дело так, чтобы должностным лицам невозможно было наживаться» [6, с. 547]. «Только те государственные устройства, которые имеют в виду общую пользу, являются, согласно со строгой справедливостью, правильными» [6, с. 456]. І ў якасці пераадолення карупцыі старажытнагрэчаскі філосаф прапанаваў адзін са спосабаў — немагчымасць адной асобе сумяшчаць дзве або больш пасады.

Неабходна адзначыць, што паняцце «карупцыя» не адразу сцвярджалася як хабарніцтва, учыненне злачынства службовай асобай. У антычнасці дадзены тэрмін толькі характарызаваў маральны стан грамадства ў цэлым [7, с. 9]. У Сярэднявеччы сацыяльны феномен «карупцыя» ужо атрымаў рэлігійную афарбоўку і апраўдваўся недасканаласцю людзей. «Corruptibilitas» — слова, якое з лацінскай мовы перакладаецца як «тленнасць», мела на ўвазе схільнасць чалавека да разбурэння, але не здольнасць браць і даваць хабары [8, с. 20].

Падыход, бліжэйшы да сучаснай трактоўкі, вызначае карупцыю як неправамернае выкарыстанне людзей, якія знаходзяцца на дзяржаўнай службе, іх паўнамоцтваў у асабістых мэтах, з’явіўся ў XVII ст., у той час, калі адбывалася ўскладненне дзяржаўнага ладу еўрапейскіх краін. Погляд фармаваўся на фоне эканамічнага росквіту, развіцця капіталістычных адносін, павелічэння значнасці рашэнняў, якія прымаліся на дзяржаўным узроўні. Прадстаўнікі буржуазіі мелі дачыненне да карумпаванасці дзяржаўных службоўцаў, а таксама непасрэдную цікавасць да «набыцця» пасад, якія маглі б надзяліць іх уладай. Менавіта таму В. Вязломцаў сцвярджае з’яўленне ў Еўропе з канца XVII ст. «парламенцкай карупцыі» [9, с. 147].

Нікола Макіявелі — італьянскі мысляр, палітычны дзеяч, філосаф (1469–1527) — адным з першых узняў тэму маштаба карупцыі ў дзяржаве і параўноўваў яе з цяжкай невылечнай хваробай: «…врачи говорят, что в начале болезнь трудно распознать, но легко излечить; если же она запущена, то ее легко распознать, но излечить трудно. Так и в делах государства: если своевременно обнаружить зарождающийся недуг, что дано лишь мудрым правителям, то избавиться от него нетрудно, но если он запущен так, что всякому виден, то никакое снадобье уже не поможет» [10, с. 14].

Томас Гобс (1588–1679) — філосаф часоў англійскай буржуазнай рэвалюцыі — адзначаў пагібельны ўплыў карупцыі, паколькі непрыняцце законаў вызначаецца карумпаванасцю дзяржаўнай улады: «Люди, кичащиеся своим богатством, смело совершают преступления в надежде, что им удастся избежать наказания путем коррумпирования государственной юстиции, или получить прощение за деньги или другие формы вознаграждения... Коррупция есть корень, из которого вытекает во все времена и при всяких соблазнах презрение ко всем законам» [11, с. 50].

Шарль Луі дэ Мантэск'ё — французскі пісьменнік, прававед і філосаф эпохі Асветніцтва (1689–1755) — лічыў верагодным дачыненне кожнага члена грамадства да злоўжывання ўладай для задавальнення сваіх уласных патрэбаў і вось што ён адзначаў з гэтай нагоды: «...всякий человек, обладающий властью, склонен злоупотреблять ею, и он идет в этом направлении, пока не достигнет положенного ему предела. А в пределе — кто бы это мог подумать! — нуждается и сама добродетель» [12, с. 98]. Мысляр называў самым эфектыўным спосабам у барацьбе з карупцыяй абмежаванне дзяржаўных служачых у кампетэнцыі ўладных паўнамоцтваў: «Чтобы не было возможности злоупотреблять властью, необходим такой порядок вещей, при котором различные власти могли бы взаимно сдерживать друг друга» [12, с. 99]. Таму ў якасці рычага кіравання ў абмежаванні ўладнымі паўнамоцтвамі паслужыў прынцып строгага падзелу ўлад на заканадаўчую, выканаўчую, судовую.

Нікола Макіявелі, Томас Гобс, Шарль Луі дэ Мантэск'ё аказалі значны ўплыў на фарміраванне адзінага разумення карупцыі і адзначылі яе негатыўнае ўздзеянне на сацыяльныя працэсы. Пры выпрацоўцы сацыяльна-філасофскага падыходу мысляры абапіраліся на мараль як на аснову фармавання асобы і грамадскага ідэалу.

З канца XIX ст. пачынаецца новая «стадыя» фарміравання канцэпцыі карупцыі. Значна павялічыўся ўдзел дзяржавы ва ўрэгуляванні працэсаў, якія назіраліся ў грамадстве. Адбывалася зараджэнне буйнога капіталу, прадстаўнікі якога перайшлі да ідэі сістэматычнай сістэмы дачы хабару, бо так змагаліся за вялікія эканамічныя выгады; стала актуальнай схема прамога ўздзеяння

на дзейнасць элітных палітыкаў і вышэйшых чыноўнікаў, паставіўшы іх на службу сваім інтарэсам [13, с. 78]. Менавіта гэты час характарызаваўся павышанай увагай з боку гуманітарных навук да феномена карупцыі.

Асаблівую ўвагу звернем на функцыянальны падыход, распрацаваны нямецкім сацыёлагам, філосафам Максіміліянам Карлам Эмілем Вэберам (1864–1920). Макс Вэбер выступаў за прынцып выбару, які ўсталёўваў кірунак пошуку для прычыннага тлумачэння феноменаў, лічачы, што ў рэальнасці няма межаў, а даследчыкі цікавяцца толькі вызначанымі з’вамі і іх аспектамі. Феномен карупцыі патрапіў у поле зроку вучоных, паколькі нашы культурныя інтарэсы і наш імпульс арыентаваны на гэтую сферу рэальнасці. Вэбер палічыў карупцыю функцыянальнай і прымальнай, калі яна задавальняе ўмову ўзмацнення пазіцыі эліт, якія гарантуюць паскарэнне змен у грамадстве [14, с. 188]. Прыхільнікі дадзенага падыходу лічаць, што карупцыя спыняе сваё існаванне пры дасягненні эканамічнага і палітычнага прызначэння ў грамадстве.

Падводзячы вынік вышэйсказанаму, адзначым, што існуе ўзаемасувязь паміж аб’ёмамі карупцыйных праяў і ўвагай да вывучэння дадзенага феномену. Асабліва гэта становіцца відавочным, калі праявы карупцыі аказваюць небяспечны ўплыў на нармальнае, здаровае функцыянаванне грамадства. У такім выпадку карупцыя набывае форму вострай сацыяльнай праблемы. Грамадства накіроўвае сваю ўвагу на пошук дэтэрмінант эскалацыі карупцыі, шляхоў і спосабаў барацьбы.

---

1. Ожегов С. И., Шведова Н. Ю. Словарь русского языка. М. : Рус. яз., 1990. 2314 с. Вернуться к статье

2. Губский Е. Ф. Философский энциклопедический словарь. М. : Совет. энцикл., 1983. 840 с. Вернуться к статье

3. Шишкарев С. Н. Сущность и социально-правовая природа коррупции // Вестн. Москов. ун-та МВД России. 2009. № 5. С. 174–179. Вернуться к статье

4. Бартошек М. С. Римское право (понятия, термины, определения) : пер. с чеш. М. : Юрид. лит., 1989. 448 с. Вернуться к статье

5. Платон. Сочинения : в 4 т. / под общ. ред. А. Ф. Лосева, В. Ф. Асмуса. СПб. : Изд-во Олега Абышко, 2007. Т. 3. Ч. 1. 752 с. Вернуться к статье

6. Аристотель. Сочинения : в 4 т. / редкол.: М. Б. Митин [и др.]. М. : Мысль, 1983. Т. 4. 832 с. Вернуться к статье

7. Жилина И. Ю. Феномен коррупции: общие подходы к изучению // Экономические и социальные проблемы России. 1998. № 2. С. 9–28. Вернуться к статье

8. Основы противодействия коррупции (системы общегосударственной этики поведения) / А. В. Вакурин [и др.]. М. : Спарк, 2000. 228 с. Вернуться к статье

9. Везломцев В. Е. Осмысление коррупции в истории социально-философской мысли // Изв. вузов. Сер. Гуманитарные науки. 2016. № 7 (2). С. 146–149. Вернуться к статье

10. Макиавелли Н. Избранные сочинения / под ред. Н. Кулиш [и др.]. М. : Художеств. лит., 1982. 514 с. Вернуться к статье

11. Гоббс Т. Левиафан / пер. с англ. А. Гетерман. М. : АСТ, 2021. 800 с. Вернуться к статье

12. Монтескье Ш.-Л. О духе законов / пер. А. Матешук. М. : Мысль, 1999. 674 с. Вернуться к статье

13. Хантингтон С. Политический порядок в меняющихся обществах. М. : Прогресс-Традиция, 2004. 480 с. Вернуться к статье

14. Вебер М. Избранные произведения / под общ. ред. Ю. Н. Давыдова [и др.]. М. : Прогресс, 1990. 808 с. Вернуться к статье